Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
___________ А. А. Корбут
«____»___________2017 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ
## Раздзел 3. КУЛЬТУРА І ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне*
*1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія (фундаментальная),*
*спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры*

2017

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту ОСВО 1-21 04 01 – 2013 і вучэбнага плана па спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры, рэг. № Д 21-1-15/13 вуч. ад 27.06.2013 г.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*Л. К. Кухто*, прафесар кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт;
*А. І. Смолік,* загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар культуралогіі, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*А. М. Кушнярэвіч,* прафесар кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», доктар мастацтвазнаўства, прафесар;
*Л. С. Кажухоўская*, загадчык кафедры маладзёжнай палітыкі і сацыякультурных камунікацый установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 11 ад 18.05. 2016 г. );
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 22.06. 2016 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. І. Смолік

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У складаных канфігурацыях канцэпцый культуры значнае месца займаюць тэорыі, з дапамогай якіх культуролагі спрабуюць вызначыць сутнасць і змест сацыяльна-культурных працэсаў. Да іх у першую чаргу варта аднесці тыпалогію культур і канцэпцыю культурна-гістарычных тыпаў. Абапіраючыся на асноўныя палажэнні названых культуралагічных тэорый, даследчыкі імкнуцца асэнсаваць розныя формы суадносін паміж культурай і цывілізацыяй, выявіць глыбінныя антрапалагічныя карані крызісу сучаснай культуры.

Сутнасць цывілізацый і культур даследчыкі інтэрпрэтуюць па-рознаму. Аналіз іх тэарэтыка-метадалагічных падыходаў сведчыць аб тым, што культуры і цывілізацыі ўяўляюць сабой вельмі складаныя амбівалентныя феномены сацыяльнага жыцця, ад узаемадзеяння якіх залежаць лёсы ўсяго чалавецтва. У значнай ступені ў сучасную эпоху актуалізуецца праблема самазахавання і пастутальнага развіцця агульнанацыянальных цывілізацый і культур.

У сувязі з гэтым знаёмства з рознымі дыскурсіўнымі практыкамі па праблемах узаемаадносін культуры і цывілізацыі з’яўляецца вельмі важным для будучых даследчыкаў культурных працэсаў.

Спецыяліст павінен:

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі ў галіне культуралогіі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных устройстваў, кіраваннем інфармацыяй і работай з камп’ютарам.

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-4. Валодаць навыкамі здаровага ладу жыцця.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спецыяліст павінен быць здольным:

ПК-1. Далучаць розныя групы насельніцтва і асобных індывідаў да працэсу стварэння, засваення, зберажэння і распаўсюджання каштоўнасцей культуры.

ПК-4. Ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сферы культуры і мастацтваў.

ПК-5. Прагназаваць, планаваць і арганізоўваць інавацыйна-метадычную і мастацка-творчую дзейнасць у сферы культуры і мастацтваў.

ПК-7. Займацца навукова-даследчай дзейнасцю ў галіне культуралогіі.

Спецыяліст па напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія (фундаментальная), акрамя таго, павінен быць здольным:

ПК-10. Выкладаць культуралагічныя дысцыпліны, вывучаць перадавы педагагічны вопыт, творча карыстацца ім у сваёй навукова-педагагічнай дзейнасці.

ПК-11. Працаваць з вучэбнымі планамі і праграмамі, метадычнымі рэкамендацыямі па арганізацыі працэсу навучання і выхавання.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны «Культура і цывілізацыя: гісторыя і сучаснасць» – выяўленне зместу культуры і цывілізацыі, сутнасці іх функцый, тыпаў, кропак узаемадзеяння, умоў дыялогу паміж імі.

Падчас выкладання дадзенай вучэбнай дысцыпліны вырашаюцца наступныя *задачы*:

– раскрыццё разнастайнасці трактовак цэнтральных для фундаментальнай культуралогіі паняццяў «культура» і «цывілізацыя»;

– выяўленне механізмаў узнікнення, вектараў і стадый змены гістарычных тыпаў цывілізацыі і культуры;

– назапашванне студэнтамі тэарэтычных ведаў, неабходных для аналізу цывілізацыйных і культурных працэсаў, якія адбываліся на працягу культурагенезу;

– фарміраванне навыкаў і ўменняў для інтэпрэтацыі з’яў, якія адбываюцца ў сучасных цывілізацыях і культурах.

У выніку засваення тэм вучэбнага курса студэнт павінен *ведаць*:

– змест і сутнасць культуралагічных ведаў, тэарэтыка-метадалагічных падыходаў да сутнасці цывілізацый і культуры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– агульныя і спецыфічныя рысы цывілізацыі і культуры;
– стадыі развіцця культурна-гістарычных тыпаў культуры;
– формы ўзаемаадносін паміж культурай і цывілізацыяй;
– крытэрыі вызначэння тыпаў цывілізацыі і культуры;
– узаемаадносіны паміж сучаснымі цывілізацыямі і роллю культуры ў наладжванні дыялогу паміж імі.

Студэнт павінен *умець:*

– аналізаваць іерархічныя структуры розных культур і цывілізацый;
– выкарыстоўваць складальнікі цывілізацыйных тэорый у канкрэтны культурна-гістарычны кантэкст;
– выяўляць цывілізацыйны і культурны змест і сэнс такіх элементаў, як рэлігія, палітыка, маральная культура, характар іх суадносін паміж сабой;
– даследаваць асновы функцыянавання розных тыпаў цывілізацый і культур;
– з пазіцый цывілізацыйных тэорый інтэрпрэтаваць тэндэнцыі развіцця культур і цывілізацый.

Студэнт павінен *валодаць:*

– тэарэтычным аналізам розных дыскурсіўных практык па праблемах узаемаадносін культуры і цывілізацыі.

Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Культура і цывілізацыя: гісторыя і сучаснасць» усяго прадугледжана 112 гадзін, з якіх 42 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 30 гадзін, семінары – 12 гадзін. Рэкамендаваная форма кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### *Тэма 1. Уводзіны*

Інтэрпрэтацыя паняцця «цывілізацыя» як грамадства, заснаванага на пачатках розуму і справядлівасці (Люс'ен Феўр «Цывілізацыя: эвалюцыя слова і групы ідэй», М. Буланжэ «Старажытнасць, раскрытая ў сваіх абычаях», Гольбах «Сістэма грамадства» і «Сістэма прыроды», В. Мірабо «Сябра чалавецтва»).

### *Тэма 2. Поліпарадыгмальны статус катэгорыі «цывілізацыя»*

Рэалістычны падыход да трактоўкі сутнасці цывілізацый (Л. Морган «Старажытнае грамадства», П. Баланжэ «Стары і юнак», Ш. Рануў'е «Кіраўніцтва да старажытнай філасофіі», Ж. Габіно «Вопыт аб няроўнасці чалавечых рас»).

Марксісцкае разуменне цывілізацыі як стадыі грамадскага развіцця (Ф. Энгельс «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы»).

Цывілізацыйны падыход да культуры прадстаўнікамі постмадэрнізму (М. Кардзін «Праблемы перыядызацыі гістарычных макрапрацэсаў», Ю. Якавец «Станаўленне постіндустрыяльнай цывілізацыі», Г. Маркузе «Эрас і цывілізацыя», А. Кробер «Прырода і культура» і інш.).

### *Тэма 3. Суадносіны культуры і цывілізацыі паводле М. Бярдзяева і М. Данілеўскага*

Культуралагічныя ідэі М. Бярдзяева («Аб культуры», «Чалавек і машына»).

Сакральны выток культуры. Культура і культ. Сімвалічная прырода культуры. Высакароднае паходжанне культуры.

Машынная, тэхнічная аснова цывілізацыі. Адсутнасць высакароднага паходжання і старажытных каранёў цывілізацыі.

Буржуазны, дэмакратычны шлях развіцця цывілізацыі.

М. Данілеўскі аб цывілізацыі і культуры («Расія і Еўропа»). Цывілізацыя як біялагічны арганізм. Сусветная гісторыя як жыццё і змена цывілізацый. Прыкметы цывілізацыі: эстэтычная, палітычная, рэлігійная, сацыяльна-эканамічная. Асноўныя законы культурна-гістарычных тыпаў цывілізацый.

Культура як творчая дзейнасць чалавека. Культура – арганічна і арыстакратычна. Абмежаванасць перыяду развіцця культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 4. Цывілізацыйны падыход да гісторыі О. Шпенглера*

Гісторыя як чаргаванне культур. Сімвалічная «прадуша» і «генетычны код» культуры. «Фізіягноміка» культуры. Восем тыпаў культуры. Пераход культуры да цывілізацыі.

Цывілізацыя як непазбежны лёс культуры. Цывілізацыя як вынік і завяршэнне развіцця культуры. Цывілізацыя – ёсць смерць духу культуры. Крытыка еўропацэнтрызму О. Шпенглерам.

### *Тэма 5. Тэорыя лакальных цывілізацый А. Дж. Тойнбі*

Адмаўленне адзінага, лінейнага, непарыўнага працэсу развіцця гісторыі. Падзел сусветнай гісторыі на лакальныя цывілізацыі.

Асноўныя змястоўныя моманты цывілізацыі: палітыка, культура, эканоміка. Стадыі цывілізацыі: узнікненне, рост, надлом, распад.

«Выклік-і-адказ» як механізм развіцця цывілізацыі. Месца і роля творчай меншасці ў развіцці цывілізацыі. Шкала крытэрыяў цывілізацыі.

Тыпы цывілізацый. «Жывыя» і «мёртвыя» цывілізацыі. Крытыка тэорыі А. Тойнбі (П. Сарокін, М. Перн).

### *Тэма 6. Агульныя прынцыпы цывілізацыйнай тэорыі П. А. Сарокіна*

Праблемы сацыялогіі культуры ў працы П. А. Сарокіна «Сацыяльная і культурная дынаміка». Культурныя суперсістэмы (цывілізацыі) функцыянуюць як рэальнае адзінства. Суадносіны цывілізацый з нацыямі і дзяржавамі. Уплыў культурных суперсістэм на ідэалогію, матэрыяльную культуру, паводзіны людзей, на іх жыццёвы шлях і лёс.

Макракатэгорыі як крыніца даследавання цывілізацый. Прасімвал (перадумова) як падмурак культурнай суперсістэмы. Прычынна-сэнсавае адзінства цывілізацыі. Іманентны характар змен у культурных суперсістэмах. Цыклічнасць перамен у цывілізацыях.

«Фазы» жыццёвага цыкла культурных суперсістэм: рост, росквіт, заняпад, адраджэнне. Крызіс сучасных культурных суперсістэм. Пераход ад пачуццёвай, тэарэтычнай, секулярнай, праметэяўскай, навукова-тэхналагічнай культуры да інтэгра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыўнага (новасярэдневяковага), эстэтыка-тэарэтычнага тыпу культуры.

Крытычны аналіз П. А. Сарокіным канцэпцый аўтараў цывілізацыйных тэорый (М. Данілеўскі, О. Шпенглер, А. Тойнбі і інш.).

### *Тэма 7. Цывілізацыйная ідэнтычнасць як важнейшы фактар развіцця сучаснага грамадства*

С. Хантынгтан аб характары сучасных цывілізацыйных працэсаў («Сутыкненне цывілізацый і пераўтварэнне сусветнага парадку»).

Інтэрпрэтацыя паняцця «цывілізацыя» С. Хантынгтанам. Цывілізацыя як найвышэйшае культурнае ўтварэнне. Аб'ектыўныя элементы цывілізацыі: мова, гісторыя, рэлігія, абычаі, грамадскія інстытуты. Цывілізацыя як самы шырокі ўзровень супольнасці і культурнай ідэнтычнасці людзей. Дынамічны характар цывілізацый. Цывілізацыя як культурная сутнасць.

Важнейшыя тыпы сучасных цывілізацый: заходняя, індуісцкая, ісламская, канфуцыянская, лацінаамерыканская, праваслаўна-славянская, японская, афрыканская. Субцывілізацыі.

Фарміраванне цывілізацыйнай самасвядомасці і ўплыў на яе заходняй цывілізацыі. Размыванне традыцыйнай ідэнтычнасці. Пераход ад культурнай ідэнтычнасці да цывілізацыйнай.

### *Тэма 8. Стратэгія развіцця сучасных цывілізацый*

Праблема каштоўнасцей і іх змяненняў у працы В. С. Сцёпіна («Пералом у цывілізацыйным развіцці. Кропкі росту каштоўнасцей»). Тры сэнсы паняцця «цывілізацыя»: а) развіццё, ускладненне і пашырэнне «другой прыроды»; б) асобы тып грамадства; в) несупадзенне культуры і цывілізацыі. Цывілізацыя як цэласны сацыяльны арганізм з адпаведным тыпам культуры. Сучасная цывілізацыя як крыніца глабальных крызісаў (экалагічны, антрапалагічны і інш.). Радыкальныя змяненні базавых каштоўнасцей культуры ў сучасных цывілізацыях. Гістарычныя тыпы цывілізацый: традыцыяналісцкі; тэхнагенны. Адносіны да чалавека і прыроды, разуменне сутнасці асобы ў традыцыяналісцкай і тэхнагеннай цывілізацыях. Рацыянальнасць, навука і тэхналогія – галоўны ідэал тэхнагеннай культуры. Месца і роля ўлады ў цывілізацыйных супольнасцях. Уплыў тэхнагеннай цывілізацыі на традыцыяналісцкія супольнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Жыццёвыя сэнсы тэхнагеннай цывілізацыі: разуменне кахання і сяброўства; вернасць і гонар; свабода і справядлівасць; абавязак і сумленне; прастора і час; праца і эканоміка і інш.

Сцэнарыі развіцця сучасных цывілізацый: а) развіццё на базе сфарміраваных каштоўнасцей; б) мадыфікацыя каштоўнасцей тэхнагеннай цывілізацыі і пераход да новага тыпу цывілізацыйнага развіцця. Складаныя самаразвіваючыяся сістэмы як перадумовы «кропак росту» новых каштоўнасцей і светапоглядных арыентацый.

### *Тэма 9. Культура як вызначальны фактар канфлікту сучасных цывілізацый*

Паглыбленне супярэчнасцей паміж цывілізацыямі на культурных граніцах (С. Хантынгтан «Сутыкненне цывілізацый», «Лінія разлому паміж цывілізацыямі»). Культурны і цывілізацыйны крытэрыі класіфікацыі краін свету.

Адрозненні паміж цывілізацыямі: рэлігійныя, псіхалагічныя, культурныя, эканамічныя, дэмаграфічныя. Узроўні канфлікту цывілізацый: макраўзровень; мікраўзровень. Хрысціянская лінія разлому ў Еўропе. Лінія разлому паміж заходняй і ісламскай цывілізацыямі. Канфлікт паміж цывілізацыямі Азіі. Канфлікты і насілле ўнутры адной цывілізацыі. Канфлікт паміж Захадам і канфуцыянска-ісламскімі дзяржавамі.

Канфлікт паміж Захадам і астатнімі цывілізацыямі – цэнтральная вось сусветнай палітыкі. Стратэгіі незаходніх цывілізацый да Захаду: ізаляцыя; прыняцце заходніх каштоўнасцей; супрацьстаянне заходняй цывілізацыі. «Сіндром брацкіх краін».

Дыялог як важнейшы фактар прадухілення міжцывілізацыйных канфліктаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 10. Усходнеславянская цывілізацыя: статус, каштоўнасныя аснаванні і культурна-гістарычныя перспектывы*

Актуалізацыя праблемы самавызначэння ўсходнеславянскіх народаў у сучаснай цывілізацыі. Усходнеславянская цывілізацыя як сукупнасць роднасных нацый, якія аб'яднаны агульнасцю сацыякультурнага ладу, гістарычнага лёсу, геаэканамічных і геапалітычных інтарэсаў і прасторавай блізкасцю.

Сацыякультурныя аснаванні ўсходнеславянскай цывілізацыі, якія абумоўліваюць яе статус і перспектывы развіцця ў

сучаснай глабалізацыйнай прасторы: геапалітычнае становішча паміж Захадам і Усходам; агульны культурны базіс; хрысціянства па ўсходнім узоры; візантыйская культурная традыцыя; устойлівыя сувязі ў ходзе гістарычнага развіцця.

Асноўныя канстанты цывілізацыйнага адзінства ўсходніх славян: антрапапрыродны сінтэізм; экафільная арыентацыя; разуменне працы як крыніцы дабрабыту; бескарыслівасць; духоўная ўзаемасувязь членаў сям'і; саборнасць і калектывізм і інш.

Перадумовы ўтварэння новага інтэгральнага ўсходне-заходняга тыпу славянскай цывілізацыі на аснове сінтэзу тэхналагічнай і экалагічнай культуры, матэрыяльнага і духоўнага пачаткаў, капіталізму і сацыялізму, традыцыйных і ліберальных каштоўнасцей. Усходнеславянская цывілізацыя ў дыялогу культур.

Рэспубліка Беларусь як самастойны суб'ект агульных камунікацыйных працэсаў міжцывілізацыйнага ўзаемадзеяння. Беларускі ўнікальны вопыт спалучэння разнастайных полікультурных уплываў, трансфармацыі навацый у самабытныя сацыяльныя і культурныя феномены. Важнейшыя кампаненты мадэлі дамінуючай сацыякультурнай ідэнтычнасці беларускага народа.

### *Тэма 11. Заходняя цывілізацыя як шырокі ўзровень культурнай ідэнтычнасці*

Гісторыка-культурныя этапы фарміравання заходняй цывілізацыі і іх характарыстыка (антычны, еўрапейскі, універсальны). Важнейшыя часткі заходняй цывілізацыі: антычная філасофія, рымскае права, хрысціянскія традыцыі. Пратэстантызм як духоўная аснова заходняй цывілізацыі. Прыкметы заходняй цывілізацыі: паскоранае развіццё навукі і тэхнікі; індывідуалізм; пазітывізм; універсальная мараль; разнастайныя ідэалогіі (лібералізм, нацыяналізм, сацыялізм і інш.) замест традыцыйных каштоўнасцей; адмаўленне ад хрысціянскіх каштоўнасцей і замена іх агульначалавечымі каштоўнасцямі; глабалізацыя. Заходняя цывілізацыя як сукупнасць культурных, палітычных і эканамічных прыкмет, аб'ядноўваючых краіны Заходняга свету і вылучаючых іх на фоне іншых дзяржаў планеты.

Тыпы заходняй цывілізацыі: еўрапейскі; паўночнаамерыканскі. Краіны, якія ўтвараюць ядро заходняй цывілізацыі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краіны Заходняй Еўропы і Цэнтральнай Еўропы, ЗША, Канада, Аўстралія, Новая Зеландыя. Сацыякультурная арыентацыя суб'ектаў заходняй цывілізацыі: індывідуалізм, лібералізм, канстытуцыялізм, правы чалавека, свабода, сіла закона, дэмакратыя, свабодны рынак, аддзяленне царквы ад дзяржавы і інш. Вестэрнізацыя і мадэрнізацыя як тэндэнцыі сусветнай супольнасці.

Глабальны крызіс Захаду ў XX ст. Пошук страчанага сэнсу жыцця як асноўны змест духоўнага жыцця краін Захаду. Супярэчлівы характар узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці асноўных каштоўнасцей заходняй цывілізацыі. Варыянты далейшага развіцця і абнаўлення заходняй цывілізацыі: «новы курс» Т. Рузвельта; народныя франты як асаблівы варыянт дэмакратычнай альтэрнатывы; скандынаўская сацыял-дэмакратычная мадэль развіцця.

Міжцывілізацыйны дыялог паміж Захадам і Усходам. Узаемаўплыў і ўзаемаабагачэнне розных тыпаў развіцця пры захаванні цывілізацыйных асаблівасцей. Рэформы заходняй арыентацыі ў краінах Усходу. Змяненні ў грамадскай свядомасці суб'ектаў заходняй культуры пад уплывам каштоўнасцей усходняй цывілізацыі.

### *Тэма 12. Цывілізацыя Старажытнай Месапатаміі*

Цывілізацыя Старажытнай Месапатаміі як вынік этнакультурнай разнастайнасці. Шумера-акадская земляробчая культура. Рэлігійна-міфічныя ўяўленні шумераў. Пісьменнасць як адно з важнейшых дасягненняў шумерскай цывілізацыі. Літаратура шумерскай эпохі (эпас аб Гільгамешы).

Вавілонская культура. Іерархія вавілонскіх багоў. Узвышэнне бога Мардука. Культавы эпас «Энума эліш». Законы Хамурапі. Мастацтва і архітэктура Вавілона: стэла цара Хамурапі, «вісячыя сады» Семіраміды, вароты багіні Іштар.

Асірыйская культура. Абарончы характар архітэктуры. Палацавае будаўніцтва. Помнікі рэльефнага стылю: «Штурм горада», «Паляванне на ільва» і інш. Бібліятэка цара Ашурбаніпала.

### *Тэма 13. Цывілізацыя Старажытнага Егіпта*

Перыядызацыя старажытнаегіпецкай цывілізацыі: дадынастычны (IV тыс. да н. э.); Старажытнае царства (2900–2270 гг. да н. э.); Сярэдняе царства (2100–1700 гг. да н. э.); Новае царства (1555–1090 гг. да н. э.); Позняе царства (XI–322 гг. да н. э.).

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

Рэлігійныя ўяўленні старажытных егіпцян. Зааморфны характар багоў. Культ бога Ра. Абагаўленне фараона. Вера ў замагільнае жыццё. Сувязь душы і цела. Уплыў рэлігіі на егіпецкую архітэктуру: мастабы, пірамiды.

Узнікненне і развіццё пісьменнасці. Вынаходніцтва папіруса. «Кніга мёртвых» – важнейшы помнік рэлігійнай літаратуры. Шматжанравасць егіпецкай літаратуры: казкі, апавяданні, байкі, настаўленні, свецкая лірыка і інш. Літаратурныя помнікі: «Праўда і Крыўда», «Казка аб двух братах», «Узяцце Яфы», «Павучэнне Аменемопе» і інш.

Мастацтва Старажытнага Егіпта. Скульптура і яе каноны: франтальнасць позы, сіметрычная пабудова адносна вертыкальнай восі, партрэтнае падабенства. Выяўленчае мастацтва. Тыпы і віды рэльефу. Манументальны жывапіс. Рысы выяўленчага мастацтва: сіметрыя, статыка, геаметрычная абагульненасць, строгая франтальнасць. Класічныя формы і тыпы архітэктуры. Манументальнасць і статычнасць – асноўныя прынцыпы архітэктуры. Музыка і яе віды: культавая, прыдворная і народная. Першыя формы шматгалосся і дырыжыравання (хейраномія).

Развіццё навуковых ведаў. Храмы як асяродкі навукі. Дасягненні егіпцян у галіне астраноміі і матэматыкі. Медыцынскія веды.

Матэрыяльная культура старажытных егіпцян.

### *Тэма 14. Антычны тып цывілізацыі як падмурак заходнееўрапейскага грамадства*

Агульная характарыстыка антычнай цывілізацыі. Прынцып антрапацэнтрызму і яго ўвасабленне ў антычнай культуры. Ідэалы і каштоўнасці старажытных грэкаў і рымлян: грамадзянская свабода і раўнапраў’е, грамадзянскі абавязак, вернасць, патрыятызм і гераізм, ушанаванне багоў, павага да продкаў. Культ меры і гармоніі як аснова светапогляду старажытных грэкаў і рымлян. Матэрыяльна-пачуццёвы і адушаўлёна-разумны касмалагізм антычных грамадзян. Дэмакратычнасць старажытных грэчаскага і рымскага грамадстваў. Эстэтызацыя сферы жыццядзейнасці грэкаў і рымлян. Дынамічны характар антычнай цывілізацыі.

Асаблівасці дзяржаўнай сістэмы Старажытнай Грэцыі і Рыма. Полісная аснова старажытнагрэчаскага грамадства. Рэс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

публіканская форма кіравання ў Старажытным Рыме. Рабаўладальніцкі лад – эканамічная аснова антычнай цывілізацыі.

Рэлігійныя ўяўленні старажытных грэкаў і рымлян. Політэізм як адметнасць рэлігіі антычнай цывілізацыі. Міфалагічная самасвядомасць суб’ектаў антычнай культуры.

Філасофія антычнай цывілізацыі: натурфіласофія, дыялектыка, аб’ектыўны ідэалізм, эмпірызм, стаіцызм, эпікурызм, неаплатанізм. Станаўленне хрысціянскай філасофіі.

Фарміраванне прававой сістэмы. Закон дванаццаці табліц. Інстітуцыі Гая.

Антычнае мастацтва. Літаратура і яе жанры: эпас, лірычная паэзія, ода, драма, трагедыя, камедыя, гімн, эпіграма, байка. Антычны тэатр. Пластычнае мастацтва: «кора» і «курас». Ураўнаважанасць, сіметрыя, гарманічнасць, статычнасць – адметнасць антычнай скульптуры. Гармонія і мера – важнейшая рыса грэчаскай і рымскай архітэктуры. Дарычны і іянічны ордэры храмавай архітэктуры.

### *Тэма 15. Старажытныя цывілізацыі Амерыкі*

Рассяленне людзей на амерыканскім кантыненце. Культурагенез Амерыкі.

Цывілізацыя альмекаў II–I тыс. да н. э. Матэрыяльная культура альмекаў: развітое земляробства, рамёствы, будаўніцтва гарадоў, тэхналогіі апрацоўкі каменю. Культ ягуара.

Альмекская культура. Цэнтры культуры альмекаў: Сан-Ларэнса, Ла-Вента, Трэс-Сапотэс, Сера-дэ-лас-Месас. Альмекскія алтары. Гіганцкія каменныя галовы. Скульптура. Іерагліфічная пісьменнасць. Каляндар. Гульня ў мячык. Дасягненні ў галіне астраноміі і гамеапатыі.

Цывілізацыя сапатэкаў. Дасягненні ў галіне земляробства: тэрасна-арашальнае земляробства, пад’ёмнікі для падачы вады. Апрацоўка меднай руды. Палітычная і адміністратыўная сістэма.

Культура сапатэкаў. Культ памерлых. Абрады ў гонар памерлых. Сакральнае значэнне поўначы і прафаннае значэнне поўдня. Дваццацірычная сістэма лічэння. Сонечны і рытуальны календары.

Станаўленне і развіццё цывілізацыі ацтэкаў. Земляробства, рамяство і гандаль – важнейшыя заняткі ацтэкаў. «Плавучыя сады» – чынампа. Калектыўная ўласнасць на зямлю. Гарады ацтэкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пераемны характар культуры ацтэкаў. Мнагалікія багі. Роля жрацоў («карміцелі багоў»). Абрад ахвярапрынашэння. Манументальная культавая скульптура. Поліхромная кераміка, мазаіка з каменю і ракавін. Унікальнасць ацтэкскага календара. Піктаграфічная пісьменнасць з элементамі іерогліфікі.

Цывілізацыя мая і яе перыядызацыя: а) фармацыйны – 1000 г. да н. э. – 325 г. н. э.; б) класічны – 325 – 925 гг.; в) мексіканскі – 975 – 1200 гг.

Культура мая. Будаўніцтва храмаў з выкарыстаннем ступеньчатага зводу. Архітэктурныя стылі: Петэн, Паленке, Рыабек, Чэнэс. Дэкаратыўны характар выяўленчага мастацтва. Міфалагічныя і рэлігійныя матывы твораў жывапісу. Круглая скульптура: барэльефы і гарэльефы. Асноўныя ідэаграмы: кропка (адзінка), злучок (пяць), стылізаваная ракавіна (нуль). Дваццацірычная сістэма лічэння (1–19). Сонечны каляндар (Хааб) і яго змест. Адметнасць Рытуальнага календара (Цолкін). Абагаўленне часу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінарскія заняткі | | |
| *Тэма 1.* Уводзіны | 1 | | | |
| *Тэма 2.* Поліпарадыгмальны статус катэгорыі «цывілізацыя» | 1 | | | |
| *Тэма 3.* Суадносіны культуры і цывілізацыі паводле М. Бярдзяева і М. Данілеўскага | 2 | 1 | | |
| *Тэма 4.* Цывілізацыйны падыход да гісторыі О. Шпенглера | 1 | 1 | | |
| *Тэма 5.* Тэорыя лакальных цывілізацый А. Дж. Тойнбі | 1 | 1 | 2 | ВА |
| *Тэма 6.* Агульныя прынцыпы цывілізацыйнай тэорыі П. А. Сарокіна | 2 | 1 | | |
| *Тэма 7.* Цывілізацыйная ідэнтычнасць як важнейшы фактар развіцця сучаснага грамадства | 2 | | 2 | круглы стол |
| *Тэма 8.* Стратэгія развіцця сучасных цывілізацый | 2 | 2 | | |
| *Тэма 9.* Культура як вызначальны фактар канфлікту сучасных цывілізацый | 2 | | | |
| *Тэма 10.* Усходнеславянская цывілізацыя: статус, каштоўнасныя аснаванні і культурна-гістарычныя перспектывы | 2 | 2 | 2 | круглы стол |
| *Тэма 11.* Заходняя цывілізацыя як шырокі ўзровень культурнай ідэнтычнасці | 2 | 1 | | |
| *Тэма 12.* Цывілізацыя Старажытнай Месапатаміі | 1 | | | |
| *Тэма 13.* Цывілізацыя Старажытнага Егіпта | 1 | | 2 | тэст |
| *Тэма 14.* Антычны тып цывілізацыі як падмурак заходнееўрапейскага грамадства | 2 | | | |
| *Тэма 15.* Старажытная цывілізацыя Амерыкі | 2 | 1 | | |
| **Усяго…** | 24 | 10 | 8 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура


*Асноўная*

*1. Агеев, Л. Б.* Формация или цивилизация? / Л. Б. Агеев, Б. С. Ерасов // Народы Азии и Африки. – 1990. – № 3. – С. 46–56.

*2. Артановский, С. Н.* На перекрестке идей и цивилизаций: исторические формы общения народов. Мировые культурные контакты. Многонациональное государство / С. Н. Артановский. – СПб. : С.-Петерб. гос. акад. культуры, 1994. – 432 с.

*3. Данилевский, Н. Я.* Россия и Европа / Н. Я. Данилевский. – М. : Ин-т русской цивилизации : Благославение, 1991. – 816 с.

*4. Завадский, С. А.* Искусство и цивилизация / С. А. Завадский, Л. И. Новикова. – М. : Искусство, 1986. – 272 с.

*5. Иванов, А. В.* Запад–Россия–Восток (Сравнительно-типологический анализ познавательных стратегий и ценностных ориентаций) / А. В. Иванов. – М. : Изд-во МГУ, 1993. – 56 с.

*6.* Кризис современной цивилизации: Выбор пути : сб. обзоров / под ред. Ф. И. Жиренко, Л. И. Василенко. – М. : ИНИОН РАН, 1992. – 124 с.

*7. Сорокин, П. А.* Человек. Цивилизация. Общество : пер. с англ. / П. А. Сорокин. – М. : Политиздат, 1992. – 543 с.

*8. Тойнби, А. Дж.* Постижение истории / А. Дж. Тойнби ; сост. А. П. Огурцов. – М. : Прогресс, 1991. – 736 с.

*9. Тойнби, А. Дж.* Цивилизация перед судом истории : сб. / А. Дж. Тойнби. – М. : Айрис-Пресс, 2003. – 592 с.

*10.* Цивилизации и культуры. Вып. 1. Россия и Восток: цивилизационные отношения. – М. : Ин-т востоковедения РАН, 1994. – 292 с.

*Дадатковая*

*1. Хантингтон, С.* Столкновение цивилизаций / С. Хантингтон. – М. : АСТ, 2003. – 603 с.

*2. Шпенглер, О.* Закат Европы. Очерки морфологии мировой культуры / О. Шпенглер ; пер. с нем., ред. А. А. Франковского. – М. : Искусство, 1993. – 304 с.

*3. Юрашевіч, І. П.* Усходнеславянскі цывілізацыйны тып у сістэме дыялогу культур Усходу і Захаду / І. П. Юрашэвіч // Вес. Беларус. дзярж. педагагічнага ўн-та імя Максіма Танка. – 2006. – № 3. – Серыя 2. – С. 50–54.

*4. Яковец, Ю. В.* История цивилизаций / Ю. В. Яковец. – М. : Владар, 1995. – 461 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння праблем сацыякультурнай практыкі, адносяцца:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
– праектныя тэхналогіі;
– камунікатыўныя тэхналогіі;
– гульнявыя тэхналогіі;
– метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання неабходнай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці выпускніка УВА ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

У якасці аднаго з элементаў выяўлення вучэбных дасягненняў студэнта магчыма выкарыстоўваць крытэрыяльна-арыентаваныя тэсты. Яны ўяўляюць сабой сукупнасць тэставых заданняў закрытай формы з адным альбо некалькімі варыянтамі правільных адказаў; заданняў на ўстанаўленне адпаведнасці паміж элементамі двух варыянтаў з адным альбо некалькімі суадносінамі і роўнай альбо рознай колькасцю элементаў і варыянтаў; заданняў адкрытай формы з фармалізаваным адказам; заданняў на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці.

Для вызначэння адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта па патрабаваннях адукацыйнага стандарту таксама магчыма выкарыстоўваць праблемныя, творчыя заданні, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Роля і месца самастойнай работы ў вучэбна-выхаваўчым працэсе УВА вызначаецца сучаснымі патрабаваннямі да выпускніка, неабходнасцю павышэння якасці адукацыі і адначасова змяшчэння часу, энерга- і працазатрат выкладчыка і студэнта на падрыхтоўку да традыцыйных лекцыйных, семінарскіх, практычных і іншых заняткаў, патрабаваннямі да ўваходжання ў сусветную адукацыйную прастору. Усё гэта ўплывае на вызначэнне статусу самастойнай работы студэнтаў як абавязковага базавага элемента прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў сацыякультурнай сферы.

Для павышэння эфектыўнасці СРС, на наш погляд, неабходна прытрымлівацца наступных рэкамендацый:

– вызначыць у пачатку семестра найбольш ключавыя тэмы фундаментальнай культуралогіі, якія садзейнічаюць фарміраванню прафесіянальнай і асобаснай кампетэнтнасці спецыяліста;

– правільна арганізаваць самастойную работу;

– ажыццяўляць сістэматычны міжсесіённы кантроль за СРС і кіраўніцтва ёю;

– стварыць спрыяльныя ўмовы для яе здзяйснення;

– рэкамендаваць неабходную вучэбную, навуковую літаратуру, перыядычныя выданні культуралагічнага профілю;

– праводзіць пры неабходнасці кансультаванне і карэкцыю памылак студэнтаў, якія дапускаюцца ў працэсе самастойнага вывучэння вызначаных тэм;

– падвесці вынікі самастойнага засваення студэнтамі пытанняў вызначаных тэм, выкарыстоўваючы розныя формы кантролю (тэсты, калёквіумы, сціслыя пісьмовыя работы, прэзентацыі і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ**
**Раздзел 3. КУЛЬТУРА І ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне*
*1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія*
*(фундаментальная),*
*спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,16. Ул.-выд. арк. 0,76. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ